Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

**Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»**

# «АЙБАЛІТЫ» СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ТЭХНІКІ

*Да 60-годдзя з часу заснавання*
***ААТ «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання»***

**Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне**

Кобрын
2021

УДК 016:631.3(476.7)
ББК 91.9:65.32(4Беи)
А37

Серыя заснавана ў 2019 годзе

***Складальнік***
галоўны бібліёграф цэнтральнай раённай бібліятэкі
*С. Д. Курачук*

А37 **«Айбаліты» сельскагаспадарчай тэхнікі** : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын : цэнтральная раённая бібліятэка, 2021. – 48 с. : фат. – (Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»).

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» дае магчымасць пазнаёміцца з гісторыяй заснавання і сённяшнім днём ААТ «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання». Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

**УДК 016:631.3(476.7)**
**ББК 91.9:65.32(4Беи)**

© Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2021

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «”Айбаліты” сельскагаспадарчай тэхнікі» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» выдадзены да 60-годдзя з часу заснавання Кобрынскай сельгастэхнікі (цяпер адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання»).

ААТ «Кобрынаграмаш» даўно займае сваю пэўную і надзейную нішу сярод прадпрыемстваў аграпрамыслова комплексу. Немагчыма ўявіць сабе гаспадарку, якая б магла працаваць без магутнай сельскагаспадарчай тэхнікі. Падтрымліваць яе ў рабочым стане - адна са шматлікіх спецыялізацый «Кобрынаграмаша».

ААТ «Кобрынаграмаш» - унікальнае прадпрыемства для нашай краіны. У адной асобе яно сумяшчае ў сабе, здавалася б, дзве несумяшчальныя функцыі - вытворцы прадукцыі і дылера Мінскага трактарнага завода па Брэсцкай вобласці. І з тым, і з другім калектыў спраўляецца паспяхова.

Інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік прадстаўлены гісторыка-эканамічным нарысам і спісам крыніц.

Выданне ўключае каля 200 крыніц. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, брашуры, главы, раздзелы з кніг, энцыклапедычныя артыкулы; часопісныя і газетныя артыкулы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Уключаны

артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1971 года. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Адбор літаратуры завершаны ў чэрвені 2021 года.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні выкарыстаны фотаздымкі розных гадоў з сайта ААТ «Кобрынаграмаш», а таксама з фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, культурай, эканомікай.

# ГІСТОРЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ НАРЫС

## *Як усё пачыналася*

*Гісторыя стварэння і станаўлення ААТ «Кобрынаграмаш» бярэ свой пачатак з 1940 года. За гады свайго існавання прадпрыемства прайшло шлях ад маленькай машынна-трактарнай станцыі да сучаснага завода з высокім узроўнем механізацыі тэхналагічных працэсаў.*

*У лютым 1940 года ў вёсцы Андронава Кобрынскага раёна была створана Кобрынская машынна-трактарная станцыя (пастанова СНК СССР і ЦК УКП(б) ад 21.01.1940). У 1944 годзе пасля вызвалення тэрыторыі Кобрынскага раёна ад фашысцкіх захопнікаў МТС аднавіла сваю дзейнасць ужо ў горадзе Кобрыне па вуліцы Влодаўскае шасэ (цяпер вуліца Дзяржынскага), дзе і здабыла сваю пастаянную прапіску (дырэктар - Андрэй Філіпавіч Наздрын). Пачынаючы з 1958 года на Кобрынскай МТС неаднаразова праводзіліся рэарганізацыі, аб'яднанні, перайменаванні і пераўтварэнні.*

20 красавіка 1961 года рашэннем Брэсцкага аблвыканкама было створана абласное аб’яднанне «Сельгастэхніка». Гэтая дата стала пачаткам новай эпохі ў развіцці і ўдасканаленні арганізацый, якія займаліся матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем калектыўных гаспадарак.

У ліпені 1961 года на базе Кобрынскай машыннатрактарнай станцыі была створана «Кобрынская

сельгастэхніка» (кіраўнік – Аляксандр Філіпавіч Малочка). 5 кастрычніка 1978 года Кобрынскае раённае аб’яднанне «Сельгастэхніка» пераўтворана ў Кобрынскае раённае вытворчае аб’яднанне па вытворча-тэхнічнаму забеспячэнню сельскай гаспадаркі «Райсельгастэхніка» (кіраўнік – Андрэй Паўлавіч Азарчук). 8 мая 1986 года райсельгастэхніка пераўтворана ў Кобрынскае раённае прадпрыемства па вытворча-тэхнічнаму абслугоўванню і матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню «Райаграпрамтэхснаб» (кіраўнік – Іван Паўлавіч Мароз). Першапачаткова прадпрыемства спецыялізавалася на рамонце вузлоў і агрэгатаў трактароў МТЗ для гаспадарак Брэстчыны. Так яно, можа, і было б далей, калі б не цяжкія 1990-я гады, калі многія прадпрыемствы не вытрымлівалі і зачыняліся. Але выратавала дальнабачная палітыка кіраўніцтва завода - на той момант прадпрыемства ўзначальваў Іван Паўлавіч Мароз.

У 1989 годзе сельгастэхніка па ўзаемнай ініцыятыве становіцца дылерам Мінскага трактарнага завода (МТЗ) па Кобрынскім раёне, праз паўгода - па васьмі раёнах Брэсцкай вобласці, а яшчэ праз паўгода сталі прадаваць трактары і запчасткі з гарантыйным абслугоўваннем па ўсёй Брэсцкай вобласці. Звярталіся нават і з іншых абласцей рэспублікі.

У 90-х гадах, калі разрываліся многія эканамічныя сувязі паміж краінамі і прадпрыемствамі, супрацоўніцтва з такім прамысловым гігантам, як МТЗ, дарагога каштавала. А галоўнае - гэта гарантавала пастаянную работу і стабільную зарплату.

Праца была арганізавана так зладжана, што на маленькае прадпрыемства ў раённым Кобрыне на Мінскім трактарным заводзе звярнулі самую сур'ёзную ўвагу. Было прапанавана вырабляць камплектуючыя для зборкі трактароў «Беларус», у прыватнасці жгуты электраабсталявання. З цягам часу тут асвоілі вытворчасць вузлоў да трактароў. Гледзячы на трактары «Беларус», кабрынчане могуць ганарыцца тым, што ў гэтай магутнай тэхніцы ёсць і часцінка іх працы.



23 кастрычніка 1996 года «Кобрынская райаграпрамтэхніка» шляхам раздзяржаўлення дзяржаўнай уласнасці і акцыянавання пераўтворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынская сельгастэхніка» (рашэнне Кобрынскага райвыканкама № 275 ад 23.07.1996 г.).

У хуткім часе, 25 жніўня 2003 года, райсельгастэхніка была рэарганізавана ў адкрытае акцыянернае таварыства з гучнай назвай «Кобрынаграмаш» і не менш гучнымі справамі праславілася пад новай шыльдай. Прадпрыемства не проста вытрымала ўсе перыпетыі часу, яно ўвайшло ў лік стабільна працуючых прадпрыемстваў рэгіёна.

## *Сапраўдны кіраўнік - палова поспеху прадпрыемства*

У 1986 годзе Кобрынскую сельгастэхніку ўзначаліў новы дырэктар Іван Паўлавіч Мароз, і пачаліся сур'ёзныя перамены.



Да гэтага прызначэння Іван Паўлавіч 22 гады працаваў на Кобрынскім аўтарамонтным заводзе: спачатку майстрам пасля заканчэння сельгастэхнікума ў Пружанах, потым - з 1969 па 1986 год начальнікам вытворча-дыспетчарскага аддзела Кобрынскага рамонтнага завода.

У 1985 годзе Іван Мароз закончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Зарэкамендаваў сябе здольным арганізатарам, вопытным спецыялістам, патрабавальным, строгім, але аб'ектыўным кіраўніком.

У 1986 годзе І. П. Мароз прызначаны на пасаду дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрынская сельгастэхніка». Пасля перайменавання ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынаграмаш» з 2003 года па жнівень 2014 года працаваў дырэктарам прадпрыемства, якое пад яго кіраўніцтвам дасягнула высокіх эканамічных і вытворчых паказчыкаў. Без малога 30 гадоў Іван Паўлавіч Мароз кіраваў прадпрыемствам з колькасцю работнікаў каля 750 чалавек.

З першых дзён работы ў райсельгастэхніцы дырэктар пачаў з навядзення дысцыпліны і парадку на ўсіх вытворчых участках. На першым жа сходзе Іван Паўлавіч заявіў калектыву: «*Я веру ў поспех, я веру ў тое, што прадпрыемства можа працаваць рытмічна і якасна, але для гэтага кожны спецыяліст і рабочы павінны самаадданa працаваць, уносіць свой уклад у агульную справу*». Не ўсім гэта спадабалася, але новы кіраўнік праявіў прынцыповую настойлівасць. І з цягам часу ўсё стала на свае месцы. Касцяк калектыву рашуча падтрымаў новага кіраўніка, а з тымі, хто не хацеў мяняць свае адносіны да работы, працаваць сумленна, давялося развітацца.

Сам дырэктар не толькі да іншых ставіўся патрабавальна, але найперш - да сябе. І даволі хутка прадэманстраваў усяму калектыву свае здольнасці выдатна арыентавацца ў запатрабаваннях рынку, уменне бачыць перспектыву. Менавіта дзякуючы гэтым яго якасцям Кобрынская райсельгастэхніка адной з першых у рэспубліцы выйшла на прамыя сувязі з Мінскім трактарным заводам і пачала выпускаць для МТЗ некалькі відаў прадукцыі, у тым ліку пярэднія восі, ступіцы, жгуты электраправодкі. А ў 1989 годзе кабрынчане сталі яшчэ і афіцыйным дылерам МТЗ па продажы трактароў прадпрыемства па Брэсцкай вобласці.

За сваю працоўную дзейнасць, прафесіяналізм Іван Паўлавіч Мароз адзначаўся на самым высокім узроўні. У 1987 годзе ўзнагароджаны медалём «За

працоўную доблесць», у 1989-м - медалём «Ветэран працы», у 1999 годзе - ордэнам Пашаны, у 2004-м - ордэнам Айчыны III ступені, а таксама граматамі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта.

Па выніках працы за 2007 год І. П. Мароз быў занесены на раённую Галерэю Працоўнай Славы раёна ў прамысловасці.

Іван Паўлавіч прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога і Кобрынскага раённага Саветаў дэпутатаў.



Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13 студзеня 2015 года № 37 «Аб прысваенні звання «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна» за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Марозу Івану Паўлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».



*Ветэраны прадпрыемства (2018 год)*

## *Сучаснасць*

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
КобринАгромаш




З 25 жніўня 2003 года ААТ «Кобрынская сельгастэхніка» перайменавана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання» (ААТ «Кобрынаграмаш»).

Сучасны «Кобрынаграмаш» - гэта высокатэхналагічны завод, які вырабляе запатрабаваны на рынку тавар: жгуты электрычных правадоў, іншую кабельную прадукцыю, дэталі пярэдняй восі да трактара МТЗ, а таксама з’яўляецца афіцыйным дылерам Мінскага трактарнага завода па продажы і сэрвісным абслугоўванні трактароў «Беларус».

ААТ «Кобрынаграмаш» - адно з вядучых прадпрыемстваў раёна ў сферы машынабудавання.

Слава аб надзейнай і бездакорнай рабоце кабрынчан імкліва разносіцца па Беларусі і за яе межамі. Электракабель і іншыя тавары з кобрынскай маркай ведаюць у Расіі, Венгрыі, Літве, Украіне. Ды і ў Беларусі з «аграмашаўцамі» супрацоўнічаюць такія славутыя прадпрыемствы, як Мінскі трактарны завод, МАЗ, «Гомсельмаш», «Амкадор», завяршыліся пасяховыя перагаворы з БелАЗам.

У 2004 годзе ААТ «Кобрынаграмаш» выйшла пераможцам у конкурсе «Лепшы пастаўшчык прадукцыі Мінскаму трактарнаму заводу» сярод 198 прэтэндэнтаў, стала лепшым дылерам Рэспублікі Беларусь па «Белаграсэрвісу», лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», што, безумоўна, найлепшым чынам сведчыць аб яе якасці.







У 2005 годзе «Кобрынаграмашу» ўручаны дзяржаўны сертыфікат, які сведчыць, што сістэма менеджменту якасці вытворчасці запасных частак і жгутоў электраправодкі да трактароў МТЗ адпавядае патрабаванням СТБ ІСО-9001.

Па якасных характарыстыках і па аб'ёмах вытворчасці ААТ «Кобрынаграмаш» няма роўных сярод аднатыпных калектываў у рэспубліцы. Безумоўна, «Кобрынаграмаш» — не адзінае ў сваім родзе прад-

прыемства ў Беларусі. Але МТЗ заказвае жгуты менавіта тут, бо кобрынскія спецыялісты не падводзяць і выпускаюць толькі якасную прадукцыю. Распрацоўка і выпуск новых мадыфікацый трактароў на мінскім заводзе не абыходзіць новаўвядзеннямі і кабрынчан. Напрыклад, толькі за 2015 год тут асвоена 87 відаў жгутоў.

З 2014 года дырэктарам ААТ «Кобрынаграмаш» стаў Віктар Рыгоравіч Белавус, у якога шмат гадоў работы ў сельскагаспадарчай галіне. Ён добра ведае яе спецыфіку, бо ў свой час працаваў галоўным бухгалтарам, старшынёй калгаса, кіраўніком Пінскага аграсэрвіса.



Віктар Рыгоравіч разумее, што за добрымі паказчыкамі дзейнасці стаіць праца кожнага чалавека. Згуртаваны працоўны калектыў – гэта добрая перадумова поспеху. На прадпрыемстве працуюць вопытныя спецыялісты, сапраўдныя прафесіяналы. Амаль кожны з іх валодае не адной, а некалькімі прафесіямі. Зацікаўленасць работнікаў, адчуванне асабістага дачынення да



агульнай справы, гонар за сваё прадпрыемства забяспечваюць поспех усяго працоўнага калектыву.

На ААТ «Кобрынаграмаш» склаўся высокапрафесійны калектыў, гатовы пастаянна павышаць сваю кваліфікацыю, каб адпавядаць сучасным запытам вытворчасці. Людзі разумеюць, што ад сумленнай і стараннай работы кожнага на яго працоўным месцы залежыць вельмі многае: і вытворчыя паказчыкі, і якасць прадукцыі, і зарплата, і рэпутацыя прадпрыемства ў цэлым. Поспех прадпрыемства - вынік калектыўных намаганняў супрацоўнікаў ААТ «Кобрынаграмаш», сапраўднай каманды, якой па плячы любыя задачы.

На сённяшні дзень прадпрыемства ажыццяўляе больш 50 відаў дзейнасці. На патрэбы сельскай гаспадаркі так ці інакш ідзе пераважная большасць і прадукцыі ААТ «Кобрынаграмаш», і паслуг, якія яно аказвае.



Асноўнымі відамі дзейнасці прадпрыемства з’яўляюцца рамонт і тэхнічнае абслугоўванне сельска-

гаспадарчай тэхнікі, вытворчасць жгутоў правадоў для аўтатрактарнага электраабсталявання і кабельнай прадукцыі. Аказваюць тут і транспартныя паслугі. Яшчэ адным напрамкам работы завода з'яўляецца вытворчасць медыцынскага кіслароду, а менавіта «закатка» яго ў балоны і дастаўка ў медыцынскія ўстановы Брэстчыны. Таксама завод вырабляе і тэхнічны кісларод.

Найбольш працаёмкім участкам працы на прадпрыемстве з'яўляецца вытворчасць жгутоў правадоў для аўтатрактарнага электраабсталявання. Жгуты правадоў, якія займаюць каля 25% ад аб’ёмаў вытворчасці, – своеасаблівая сістэма, без якой немагчыма ўявіць работу тэхнікі.



*Некалькі цікавых фактаў*: у адным жгуце можа знаходзіцца да 100 відаў кабельнай прадукцыі, а ў наш тэхналагічны час у яго вытворчасці нязменнай застаецца вялікая доля ручной працы. Яна дазваляе пры неабходнасці хутка пераключыцца на новыя вырабы без высокіх затрат на пераабсталяванне. Пры гэтым прадукцыя ААТ «Кобрынаграмаш» з лёгкасцю праходзіць самы строгі кантроль якасці і не залежваецца на

складах. Жгуты з Кобрына пастаўляюцца не толькі на Мінскі трактарны завод, але і на іншыя прадпрыемствы холдынга «МТЗ».

У ліку асноўных відаў дзейнасці таксама вытворчасць кабельнай прадукцыі. На прадпрыемстве пастаянна працуюць над засваеннем новых відаў. Павелічэнне наменклатуры выпускаемай прадукцыі дадзенага выгляду адбываецца як за кошт павелічэння яе тыпаразмераў, так і за кошт асваення і запуску ў серыйную вытворчасць новых відаў. Пастаяннымі спажыўцамі кабеляў з'яўляюцца адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Клецкі механічны завод», «Гомсельмаш» і іншыя.



Вельмі адказная справа – выкананне функцый тэхнічнага цэнтра, які ажыццяўляе гарантыйнае і паслягарантыйнае абслугоўванне сельскагаспадарчай тэхнікі маркі «МТЗ». Напрыклад, падчас палявых работ пры ўзнікненні няспраўнасці трактар на гарантыі павінен быць адрамантаваны за 24 гадзіны.

Аб'ём вытворчасці запасных дэталяў і вузлоў да трактароў «Беларус» у параўнанні з вышэйпералічанымі відамі прадукцыі меншы, але гэты від дзейнасці на прадпрыемстве разглядаюць як адзін з асноўных. Беларускія трактары ведаюць практычна на ўсіх кантынентах, а ўлічваючы той факт, што на 50 працэнтаў Мінскі трактарны завод забяспечваецца жгутамі правадоў «Кобрынаграмаша», то іх прадукцыю добра ведаюць далёка за межамі Беларусі.

У цяперашні час, па словах дырэктара Віктара Белавуса, галоўнае для прадпрыемства - гэта прадаць выробленую прадукцыю. Важнай задачай з’яўляецца пашырэнне рынкаў збыту. Для гэтага тут працуе аддзел маркетынгу, які, дарэчы, пастаянна расце колькасна і развіваецца якасна. Прадукцыя прадпрыемства рэалізуецца спажыўцам на ўнутраным і знешніх рынках.

Паслугі і прадукцыя ААТ «Кобрынаграмаш» - гэта істотны ўклад у машынабудаванне і залог паспяховай дзейнасці аграпрамысловага комплексу краіны. Але трэба адзначыць, што хоць юрыдычна «Кобрынаграмаш» працягвае заставацца ў падпарадкаванні Міністэрства сельскай гаспадаркі, дэ-факта ён з'яўляецца шматпрофільным прамысловым прадпрыемствам, чыя выпускаемая прадукцыя, нягледзячы на назву, моцна «завязана» не толькі на задавальненні патрэбаў аграрыяў вобласці і краіны. Калектыў ААТ «Кобрынаграмаш» упэўнены, што адным з элементаў паспяховай работы прадпрыемства з’яўляецца шматпрофільнасць.

***Дылерскі цэнтр — самае вялікае падраздзяленне ААТ «Кобрынаграмаш»***

На працягу многіх гадоў ААТ «Кобрынаграмаш» з'яўляецца афіцыйным дылерам Мінскага трактарнага завода. А гэта вялікі аб'ём паслуг па рэалізацыі і гарантаванаму абслугоўванню новай тэхнікі МТЗ і пастаўка аграрнікам Брэстчыны запасных частак.

Дылерскі цэнтр складаецца са спецыялістаў і рабочых высокай кваліфікацыі, якая дазваляе ім выконваць якаснае і своечасовае абслугоўванне трактароў «Беларус» у 12 раёнах Брэсцкай вобласці. У абавязкі яго супрацоўнікаў уваходзіць гарантыйнае і пасля-гарантыйнае абслугоўванне, а таксама рамонт трактароў маркі «Беларус». Тут займаюцца практычна поўным аднаўленнем тэхнікі і рамантуюць усё, нават электраабсталяванне, акрамя рухавікоў. Практыкуецца і вузлавы рамонт, калі ў цэнтр дастаўляецца не трактар, а толькі нейкі пэўны вузел.

Калі трактар можна даставіць на прадпрыемства, то рамонтныя работы праводзяцца ў Кобрыне, а калі такой магчымасці няма, то спецыялісты выязджаюць на месца. Для гэтага ёсць аўтамабільныя брыгады з адпаведным транспартам на пастаяннай аснове, якія гатовы ў любы час выехаць у любую кропку вобласці. Сапраўдная «хуткая дапамога» для жалезных «працаўнікоў»!

Калектыў дылерскага цэнтра годна спраўляецца са ўсімі пастаўленымі перад ім задачамі. На сваю працу цэнтр дае гадавую гарантыю і, нягледзячы на вялікую

канкурэнтнасць, заўсёды пацвярджае высокую якасць паслуг. Увогуле, на якасць выкананых работ нараканняў няма, таму што на прадпрыемстве працуюць кваліфікаванныя, адказныя спецыялісты. Дылерскі цэнтр — гэта самае баявое падраздзяленне ААТ «Кобрынаграмаш».

За высокія поспехі ў галіне якасці калектыў прадпрыемства быў неаднаразова ўдастоены ўзнагарод і дыпломаў.







Дзякуючы высокай якасці прадукцыі і дастойнаму ўзроўню абслугоўвання тэхнікі, ААТ «Кобрынаграмаш» нават у складаных сацыяльна-эканамічных умовах застаецца на плаву.

Адным з прыярытэтаў у ***сацыяльнай сферы*** прадпрыемства з'яўляецца прапаганда здаровага ладу жыцця. Работнікі завода прымаюць актыўны ўдзел у спаборніцтвах рознага ўзроўню і дастойна адстойваюць гонар прадпрыемства.

На рахунку спартсменаў ААТ «Кобрынаграмаш» вялікая колькасць грамат. Па выніках 2015 года завод па колькасці прызавых месцаў заняў трэцяе месца сярод усіх прадпрыемстваў раёна. У 2017 годзе – другое месца ў спартакіядзе працоўных калектываў сярод прадпрыем-

стваў горада Кобрына з лікам працуючых да 300




чалавек. Таксама ў 2017 годзе сярод прадпрыемстваў Кобрына з лікам працуючых да 300 чалавек - першае месца ў 23-й спартакіядзе. У маі 2018 года - другое месца ў спартакіядзе працоўных калектываў сярод прадпрыемстваў горада Кобрына.



На ААТ «Кобрынаграмаш» створаны ўсе неабходныя ўмовы для плённай працы. Тут шмат увагі надаюць ахове працы: ёсць гардэробныя, пакоі прыёму ежы, спецвопратка, неабходныя сродкі абароны.

Пытанні аховы працы, дысцыпліна, адказнасць і зладжанасць калектыву ствараюць спрыяльную глебу для бяспечнай працы.

**Аснова стратэгіі ААТ «Кобрынаграмаш» на сёння і заўтра нязменная: нельга спыняцца на дасягнутым.**

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
КобринАгромаш

**ААТ «КОБРЫНАГРАМАШ» - прадпрыемства не самая вялікае ў горадзе, але яно стабільна працуе, і яго прадукцыя карыстаецца ўстойлівым попытам у спажыўцоў. Здольнасць хутка рэагаваць на зменлівыя патрэбы рынку ў сучасных рэаліях з’яўляецца неабходнай умовай для надзейнай работы прадпрыемства. Як вынік – завод упэўнена глядзіць у заўтрашні дзень. Ёсць і планы на будучыню. Адным словам – завод жыве.**



# СПІС КРЫНІЦ

**Березовский, Г. В.** История сельхозтехники Брестской области / Г. В. Березовский. – Барановичи : Барановичская укрупн. типография, 2001.

См. на с. 472-473,501,508,520,534-535,551.

**Березовский, Г. В.** Кобринская «Райагропромтехника» - специализированное предприятие по ремонту колесных тракторов / Г. В. Березовский // История сельхозтехники Брестской области / Г. В. Березовский. – Барановичи, 2001. – С. 280-286.

**Березовский, Г. В.** Мороз Иван Павлович – директор Кобринской райагропромтехники (06.1986 – по н. в.) / Г. В. Березовский // История сельхозтехники Брестской области / Г. В. Березовский. - Барановичи, 2001. – С. 551.

**Кобринский** район. Завод агропромышленного машиностроения. Открытое акционерное общество «Кобринский завод агропромышленного машиностроения» // Брестчина производит, предлагает, приглашает : каталог-справочник. – Барановичи, 2004. - С. 144.

**Мороз Иван Павлович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь : справочное издание / под ред. И. В. Чекалова. – Минск, 2005. – Т. 2. – С. 239.

**Открытое** акционерное общество «Кобрин-агромаш» // Инвестиционные возможности Брестской области. Кобринский район. – Брест, 2004. - С. 27.

**Пути** решения Продовольственной програмы : семинар. – Брест, 1983.

См. на с. 25.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 62-63 : фат.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020. – С. 53-54 : фат.

**Юбілейныя** даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна. Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынскі завод аграпрамысловага машынабудавання» (1961) – 60 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 28.

**Мануйлик, М.** За дело беремся смело / Марина Мануйлик ; фото Вадима Якубёнка // 7 дней. - 2021. — 6—12 мая (№ 18). — С. 17 : фот.

О работе ОАО «Кобринагромаш» по изготовлению жгутов для тракторов в г. Кобрине.

**Бялоў, Д.** Віктар Белавус: «Час патрабуе шматвектарнасці» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020. - 15 студзеня (№ 3). - С. 5 : фат.

Дырэктар ААТ «Кобрынаграмаш» В. Белавус расказаў аб некаторых накірунках працы прадпрыемства.

**Литвинович, Е.** И тянется медная «нить» / Евгений Литвинович ; фото Александра Шульгача // Заря. - 2020. - 11 декабря (№ 4). - С. 9.

Об истории создания ОАО «Кобринагромаш».

**Дубина, Л.** Предприятие с большой историей / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2018. - 30 чэрвеня. - С. 3.

**Елизарова, Ж.** Ветераны завода под надежной опекой / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. - 20 кастрычніка. - С. 4.

В ОАО «Кобринагромаш» прошло собрание ветеранской организации.

**Пашкович, Л.** «Агромаш»: цифры, которые радуют / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2018. — 28 лістапада. — С. 3.

**Бакун, А.** Вялікая сіла маладосці / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 24 чэрвеня. — С. 3.

Інжынер-хімік ААТ «Кобрынаграмаш» К. Слуцкая - адказны, энэргічны, дысцыплінаваны работнік.

**Бакун, Е.** Где дело само за себя говорит / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 5 красавіка. — С. 5.

Почетный гражданин Кобринского района И. П. Мороз прошел путь от рядового техника-механика до управляющего предприятия.

**Муха, Ф**. В активном поиске новых партнеров / Федор Муха // Заря. - 2017. - 28 января. - С. 6.

По итогам года ОАО «Кобринагромаш» выполнило все свои финансово-хозяйственные показатели.

**Пашкович, Л.** Работа на достойный результат / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2017. – 24 мая. – С. 3

ОАО «Кобринагромаш» работает прибыльно.

**Дубіна, Л.** З любоўю да Радзімы па жыцці / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. - 25 чэрвеня. - С. 2.

У ААТ «Кобрынаграмаш» начальнікам цэха кабельнай прадукцыі працуе Д. Крачко.

**Отчет** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного общества «Кобринский завод агропромышленного машиностроения» за 2015 год // Кобрынскі веснік. - 2016. - 30 сакавіка. - С. 6.

**Белов, Д.** В центре внимания - прогнозные показатели / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2015. - 8 жніўня. - С. 3.

Состоялось выездное заседание Кобринского районного Совета депутатов на базе ОАО «Кобринский завод агропромышленного машиностроения».

**Дилер** знает цену. Себе и своим услугам // Сельская газета. - 2015. - 25 июня. - С. 12.

В этом году ОАО «Кобринагромаш» восстановило более 70 тракторов.

**Лесик, И**. Союз оказался прочным / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. – 2015. – 14 студзеня. – С. 4.

Заслуги И. П. Мороза, 28 лет руководившего коллективом ОАО «Кобринагромаш», отмечены орденом, медалями и уважением коллег.

**Лучшие** в сервисной сети // Сельская газета. - 2015. - 25 июня. - С. 13.

Среди лучших - директор ОАО «Кобринагромаш» В. Г. Белоус.

**Муха, Ф.** «Беларус» стартует в Кобрине / Федор Муха ; фото Александра Шульгача // Заря. - 2015. - 3 декабря. - С. 19.

**Ніжнік, Н.** Жгуты жаночымі рукамі / Наталля Ніжнік // Кобрынскі веснік. - 2015. - 14 лістапада. - С. 3.

Пра цэх вытворчасці жгутоў на ААТ «Кобрынаграмаш».

**Ніжнік, Н.** Тэхніка павінна працаваць добра / Наталля Ніжнік // Кобрынскі веснік. - 2015. - 26 жніўня. - С. 2.

Дылерскі цэнтр - самае вялікае падраздзяленне ААТ «Кобрынаграмаш».

**Отчёт** об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Кобринский завод агропромышленого машиностроения» за 2014 год // Кобрынскі веснік. - 2015. - 28 сакавіка. - С. 9.

**Савчук, М.** Трудовой стаж длиной в полвека / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. - 5 февраля. - С. 4.

Трудовой путь И. П. Мороза, 28 лет возглавлявшего коллектив сельхозтехники, отмечен новым званием - «Почетный гражданин Кобринского района».

**Шульгач, А**. «Беларус» стартует в Кобрине / Александр Шульгач // Заря. - 2015. - 3 декабря. - С. 19.

**Дубіна, Л.** Віктар Белавус: «Лепшае захаваем» / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2014. – 19 лістапада. – С. 2.

ААТ «Кобрынаграмаш» нядаўна ўзначаліў Віктар Белавус.

**Лесик, И.** Разумное решение – экономия в миллионы / Ирина Лесик // Кобрынскі веснік. - 2014. – 5 ліпеня. – С. 4.

Благодаря идее начальника энергомеханического отдела ОАО «Кобринагромаш» С. Кравчука ежемесячно экономится электроэнергии на сумму более 7 млн. бел. рублей.

**Отчет** об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Кобринагромаш» за 2013 год // Кобрынскі веснік. - 2014. - 29 сакавіка. - С. 10.

**Савчук, М.** Слесарь с женскими руками / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2014. - 6 марта. - С. 5.

